## ЖДАН АЛЕГ (сапраўдн. ПУШКІН АЛЕГ АЛЯКСЕЕВІЧ) – 75

Нарадзіўся ў г. Смаленску ў 1938 г. Дзіцячыя і юнацкія гады прайшлі ў Мсціславе, дзе ў 1954 г. ён скончыў школу. У 1959 г. скончыў гісторыка-геаграфічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. Чатыры гады вывучаў геаграфію вялікай краіны, непасрэдна «рабіў» яе гісторыю. Працаваў на будаўніцтве Карагандзінскага металургічнага камбіната, Братскага лесапрамысловага комплексу, у Прыташкенцкай геафізічнай партыі (тут спатрэбіліся веды па геалогіі і геамарфалогіі, што былі атрыманы ў інстытуце) на розных пасадах.

У 1963 г. ён вярнуўся ў Беларусь і больш за 8 гадоў працаваў на Мінскім трактарным заводзе ў ліцейным цэху, затым – рэдактарам на Беларускім тэлебачанні (1972-1973) і кінастудыі «Беларусьфільм» (1973-1976), загадчыкам аддзела грамадскага жыцця і культуры ў часопісе «Нёман». У 1998 г. прызначаны дырэктарам выдавецтва «Вышэйшая школа».

Літаратурную дзейнасць А. Ждан пачаў у 1963 г. з апавядання «Санька, Туся и бригадир» у штотыднёвіку «Литературная Россия». Публікаваўся ў часопісах «Новый мир», «Знамя», «Дружба народов», «Юность», «Нёман», «Полымя» і інш. Піша на рускай і беларускай мовах. Апублікаваў кнігі прозы «Во время прощания» (1975), «Знакомый» (1977), «В гостях и дома» (1977), «Черты лица» (1985), «По обе стороны проходной» (1987), «Самостоятельная жизнь» (1990), напісаў п’есы «Солгали богу, солгали» (1993), «Семья для старой собаки» (1995), «Калитка» (1998). Асноўныя тэмы творчасці – радзіма, жыццё людзей працы. Яго творы перакладзеныя на польскую, нямецкую, італьянскую мовы. У 1969 г. завочна скончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага (Масква), у 1983 г. прыняты ў Саюз пісьменнікаў СССР.

У 1978 г. А. Ждан скончыў Вышэйшыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў у Маскве. Па яго сцэнарам зняты мастацкія фільмы «Честный, умный, неженатый» («Мосфильм», 1980), «Хотите любите, хотите нет» (у суаўт. з С. Чарных, «Беларусьфільм», 1986).

*У.Г. Хамякоў*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова